**Пашкевіч, Т.** Няхай войны будуць толькі гісторыяй / Т. Пашкевіч // Витебские вести. — 2019. — 19 февр. — С. 3.

## НЯХАЙ ВОЙНЫ БУДУЦЬ ТОЛЬКІ ГІСТОРЫЯЙ



На ўрачыстым сходзе, прысвечаным 30-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана, міярчаніна Івана Юхно чакаў сюрпрыз. Праз 31 год яго знайшла ўзнагарода – нагрудны знак ЦК УЛКСМ «Воінская доблесць». Увесь гэты час яна захоўвалася ў асабістым архіве камсорга часці Вячаслава Белавуса. У1988 годзе ён не паспеў уручыць знак байцу. Паранены, той ляжаў у шпіталі, а калі не вярнуўся ў часць, там палічылі, што не выжыў. А далей падзеі развіваліся хутка. Вывад войскаў, уладкаванне новага жыцця. Мінулі гады, пакуль былы камсорг не пачаў шукаць у сеціве аднапалчан. І аднойчы натыкнуўся на прозвішча Юхно.

– У Афганістан трапіў, як усе: прызыў, вучэбка, пералёт у далёкую краіну, дзе ўжо не адзін год ішла вайна. Ведаў, куды і навошта адпраўляюся, што магу не вярнуцца адтуль. Але трэба было абараняць паўднёвыя рубяжы нашай краіны, і, як многія іншыя, напісаў заяву, што хачу ў Афганістан, – успамінае воін-інтэрнацыяналіст Іван Юхно. – Праўда, туды ехаў не зялёным салдацікам. Паўгода спецпадрыхтоўкі – страявой, агнявой, фізічнай, якую прайшлі з таварышамі ў Фергане, зрабілі нас вынослівымі мужчынамі. Мы скакалі з парашутам, бегалі ў спёку ў поўнай экіпіроўцы 10-кіламетровы крос, а да яго яшчэ 7 км да месца старту і столькі ж назад. 18-кілаграмовая бронекамізэлька, аўтамат, рукзак дэсантніка з 8 кг жвіру для вагі – нагрузка не для слабых. Вучыліся браць чужыя ўмацаванні і абараняць свае. Ведалі, што ў чужой краіне гэта дапаможа не проста выжыць, а паспяхова ваяваць.

У 1986 годзе вайна была ў самым разгары. Службу пачынаў у Кабуле ў 350-м палку ПДВ 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі, у народзе – «палцінніку», так яшчэ называлі Віцебскі дэсантны полк. Спачатку аўтаматчыкам, потым вадзіцелем «ЗІЛа-130», а пазней «Урала-4320». Вазіў боепрыпасы, прадукты, амуніцыю ад граніцы СССР да месцаў дыслакацыі часцей у Афганістане.

Праўда, у той час, паведаміў Іван Юзафавіч, вадзіцелі не сядзелі ў кабіне зусім безабаронныя. Лабавое шкло закрывала браня, для агляду заставалася толькі невялікае акенца, дзверцы былі таксама браніраваныя, а шкло ў іх з боку вадзіцеля яны закрывалі сваімі бронекамізэлькамі. Гэта ратавала ад кулі, але не дапамагала пры больш сур'езным абстрэле.

– Практыкай душманаў было падбіць у калоне першую і апошнюю машыны, запячатаць у вогненым катле астатнія, – сказаў ветэран-«афганец». – Таму мелі загад камандавання выходзіць

з-пад абстрэлу. Калі не ўдалося – пакідаць машыны, адыходзіць ад іх як мага далей і займаць абарону. Не забываць глядзець пад ногі, бо ўздоўж дарогі ставіліся расцяжкі, і калі ацалеў у машыне, мог падарвацца на міне.

Амаль за два гады службы Іван Юзафавіч скалясіў Афганістан уздоўж і ўпоперак. Бачыў на абочынах новенькія гадзіннікі і лялек-прыгажунь. Але не пакваліўся на прыгожыя рэчы, бо ведаў: проста так іх ніхто не кінуў бы, дакранешся – чакай выбуху. А на пераездах і так хапала кровапралітных сутычак.

Аднойчы, калі вёз 24 скрыні снарадаў «Град», трапіў пад абстрэл. Кінуць машыну з боепрыпасамі для знішчэння не змог. Цісну на газ і гнаў машыну па горнай дарозе, каб схавацца за якім-небудзь паваротам. Яму ўдалося выйсці з зоны абстрэлу, даехаць да месца назначэння. А там, калі агледзеў кузаў, перахрысціўся. Борт быў прашыты аўтаматнай чаргой, на шчасце, не наскрозь.

Сваю першую баявую ўзнагароду – медаль «За адвагу» – атрымаў за аперацыю «Хост». Іх часць мела заданне ачысціць ад «духаў» адзін з горных раёнаў. Іван Юхно з іншымі вадзіцелямі стаяў у тую ноч на блоку. Калі цемра накрыла перавал, на іх напалі. Але ліквідаваць не змаглі. Байцы далі адпор і захавалі кантроль над дарогай і навакольнай тэрыторыяй.

Другі раз у сур'ёзны пераплёт Іван трапіў, калі ў складзе тысячнай калоны з машын і тэхнікі вёў свой «Урал» на Кандагар.

– Гэты пераход быў цяжкі сам па сабе. Па серпанціне на дзясяткі кіламетраў трэба было ўзняцца на гару. Закладвала вушы, хацелася спаць, бо на працягу тыдня адпачывалі толькі па 2–3 гадзіны, пераграваліся маторы машын... І такія калоны, хоць яны і мелі прыкрыццё зверху, «пасвілі» душманы. Мне заставалася да канца службы менш чым месяц. Непрыемнасцей не хацелася, – прызнаўся Іван Юхно.

Але, напэўна, калі пачынаеш баяцца, яны і здараюцца. На адным з прыпынкаў на іх калону пасыпаліся гранаты. Душманы прыцэльна білі па машынах з гранатамётаў. Схапіўшы бронекамізэльку і аўтамат, баец адкрыў дзверцу, каб выскачыць з кабіны. І тут грамыхнула побач так, што заклала вушы, перад вачыма паплыло, далей – цемра.

Ачнуўся Іван у палатцы, кантужаны, з перабітай нагой і пасечаным асколкамі целам. Паранены, але жывы. Ад смерці выратавала браніраваная дзверка машыны, якая, як шчытом, прыкрыла вадзіцеля пры выбуху.

У шпіталь яго разам з цяжкапараненым малодзенькім лейтэнантам вывезлі на «вяртушцы». Затым былі аперацыя і вяртанне ў Савецкі Саюз з кіёчкам у руках і рэшткамі асколкаў пад лапаткай. Услед прыйшла вестка аб ўзнагароджанні ордэнам Чырвонай Зоркі.

Успамінаць пра падзеі таго часу Іван Юхно не любіць. Бачыў гераізм і страх, радасць і боль, пакуты і смерць – перажыванні часцей горкія, чым радасныя. Яны і сёння трывожаць, пазбаўляюць сну. Але тады ён сам выбраў Афганістан. Маці перадпенсійнага ўзросту была ўдавой. Адзіны ў сям'і сын мог не служыць у арміі. Але хлопец лічыў, што абавязаны абараняць Айчыну і свядома пайшоў «за рэчку». Сёння ж падобнай службы не жадае нікому з юнакоў, лічыць, што няхай войны застануцца для іх толькі гісторыяй.

**Тамара ПАШКЕВІЧ**